У рамках інфармацыйна-адукацыйнага праекта "ШАГ" па тэме «Гонар за Беларусь. Наша прамысловасць – надзейны фундамент незалежнасці» (развіццё машынабудавання, хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці, вытворчасць калійных угнаенняў) перад вучнямі выступіў дырэктар установы адукацыі Залуцкі В.Ч. Віктар Часлававіч зазначыў, што машынабудаванне з'яўляецца вядучай галіной, апорай і рухаючай сілай эканомікі краіны, адыгрывае важную ролю ў сацыяльна-эканамічным і інтэлектуальным развіцці дзяржавы і па праве лічыцца фундаментам усяго прамысловага комплексу. Сёння прамысловыя прадпрыемствы Рэспублікі Беларусь вырабляюць усю транспартную лінейку: веласіпеды, матацыклы, легкавыя аўтамабілі, аўтобусы, тралейбусы, цягнікі і вагоны, аэрадромную і шахтную тэхніку, трактары і іншыя машыны для сельскай гаспадаркі, тэхніку для дарожнага будаўніцтва і лесапрамысловага комплексу, грузавыя аўтамабілі, грузавыя аўтамабілі у тым ліку самыя вялікія ў свеце кар'ерныя самазвалы. Таксама вырабляюць металапрадукцыю, станкі, мікра- і оптаэлектроніку, лазерную тэхніку і электратэхнічную прадукцыю...

